# 2009 год – юбілейны для клуба “Спадчына” і яго старшыні Анатоля Белага



Увогуле цяперашні 2009 год – ажно тройчы юбілейны: 10 год з адкрыцця музея А. Белага ў Старых Дарогах, 25 год з адкрыцця самой культура-асветніцкай установы – клуба “Спадчына” і 10 снежня спаўняецца 70 год неадменнаму старшыні клубу “Спадчына” і арганізатару і ўладальніку музея ў Старых Дарогах Анатолю Яўхімавічу Беламу.

Як звычайна ў такіх выпадках, перш за ўсё трэба адзначыць самога юбіляра – Анатоля Белага. ¨н прыйшоў да кіраўніцтва клубам, а потым і музеем, ужо маючы пэўны жыццёвы досвед. ¨н не толькі скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, але і доўгі час выкладаў у ім філасофію. Я з ім пазнаёміўся яшчэ ў пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя і таму магу болей пра яго паведаміць. У Анатоля Белага адразу праявілася цікавасць да гісторыі культуры роднай зямлі, да гісторыі роднай Беларусі. Усё гэта і прывяло да стварэння клуба ў сакавіку 1984 года.

Паколькі я звязаны з клубам “Спадчына” ад самага пачатку яго дзейнасці, то магу і ўспомніць і некаторыя кірункі дзейнасці клуба. Да гэтага трэба дадаць, што арганізатарам быў не толькі выкладчык нашага галоўнага універсітэта краіны, але і чалавек з добрым досведам у жыцці. Анатоль Белы служыў у савецкай авіяцыі, даслужыўся да звання капітана. А гэта таксама патрабуе пэўнага шанавання.

Ад самага пачатку сваёй дзейнасці Анатоль Белы паказаў сябе і аматарам стварэння калекцый твораў жывапісу, графікі, медальерства, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А. Белы – не толькі калекцыянер, але і папулярызатар беларускага мастацтва; ён арганізуе выставы сваіх твораў, выдае каталогі, даведачную літаратуру і артыкулы. Усё гэта, а таксама назапашаныя матэрыялы, прывялі яго да стварэння свайго музея на сваім участку ў Старых Дарогах.

Клуб “Спадчына” – адна з першых беларускіх нацыянальных суполак, якая яшчэ да пачатку перабудовы савецкага грамадства ў нялёгкіх умовах, калі ўлады забаранялі яе паседжанні, пачала, пад кіраўніцтвам А. Белага, актыўную дзейнасць па прапагандзе і папулярызацыі беларускай гісторыі. Ад таго часу стварылася нямала беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый, клубаў, суполак. Многія існавалі некалькі гадоў і зніклі. А клуб “Спадчына”, дзякуючы Анатолю Яўхімавічу Беларму і групе яго актыўных паплечнікаў, што складаюць ядро клуба, выстаяў, мае ўжо сваю гісторыю і працягвае сваю актыўную дзейнасць.

Асобна трэба адзначыць і стварэнне прыватнага музея Анатоля Белага ў Старых Дарогах, дзе адчынена карцінная галерэя, а перад сядзібай музея пастаўлены помнікі дзеячам культуры. Вялікую справу зрабіў юбіляр Анатоль Белы па арганізацыі ўстанаўлення помнікаў у Менску – Ф. Скарыну, М. Гусоўскаму, Ефрасінні Полацкай (у Менску і Полацку), бюста А. Багдановічу ў Ханопенічах, помніка М. Багдановічу ў Яраслаўлі і іншых. А. Белы таксама і старшыня камітэту ўшанавання, які ўзнагоджвае выдатных людзей Беларусі.

Клуб “Спадчына” займаецца і выдавецкай справай, выдаючы альманахі з назвай клуба і газету.

Клуб “Спадчына” дзейнічае і цяпер у агульным рэчышчы беларускага Адраджэння.

Віншую нашага юбіляра. Анатоля Яўхімавіча Белага і жадаю яму здароўя, яшчэ новых і новых поспехаў у яго шляхетнай справе.

Жыве Беларусь!

***Анатоль Грыцкевіч,***
*ганаровы сябра клуба “Спадчына”.*

**На здымку:** *у музеі Анатоля Белага ў Старых Дарогах.*

# Майстры паэтычнага слова на Лідчыне



2 снежня Лідчыну наведалі выбітныя майстры беларускага паэтычнага слова Леанід Дранько-Майсюк і Эдуард Акулін.

Першая сустрэча ў фармаце ўрока сучаснай беларускай літаратуры прайшла ў актавай зале Лідскага каледжа па вул. Савецкай.





Другая сустрэча прайшла ў Крупаўскай сярэдняй школе Лідскага раёна, у памяшкані адчыненага сёлета музея Ігната Дамейкі і гісторыі школы.

Абодва спатканні вызначаліся высокім мастацкім і патрыятычным узроўнем. Студэнты і вучні маглі ў поўнай меры наталіцца напеўнаю беларускаю мовай ў вершах абодвух майстроў і непасрэдна ў песнях Эдуарда Акуліна у тым ліку і на словы Леаніда Дранько-Майсюка.

Паэтычныя імпрэзы былі арганізаваныя Лідскай Гарадской арганізацыяй ТБМ імя Ф. Скарыны і рэдакцыяй часопіса “Верасень”.

***Наш кар.***

# Да 20-годдзя Лідскага ТБМ

**13 снежня 2009 г. у 12.00** у канферэнц-зале Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы.адбудзецца святочная імпрэза з нагоды 20-годдзя ўстаноўчай канферэнцыі па стварэнні Лідскай гарадской арганізацыі Грамадскага аб’яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”, якая адбылася 16 снежня 1989 года.

У імпрэзе прымуць удзел старшыня ГА “ТБМ імя Ф. Скарыны” **Алег Трусаў** і намеснік старшыні ГА “ТБМ імя Ф. Скарыны” **Алена Анісім**.

У праграме імпрэзы:

1. Святочная справаздача і гістарычны экскурс у 20-годдзе дзейнасці ТБМ у Лідзе;
2. Успаміны ветэранаў лідскіх арганізацый ТБМ;
3. Прэзентацыя кнігі “Летапіс ТБМ, 1989-2009”;
4. Прэзентацыя кнігі кандыдата гістарычных навук Алега Трусава “Невядомая нам краіна. Беларусь у яе этнаграфічных межах”.
5. Прадстаўленне новых правілаў правапісу беларускай мовы, якія ўвойдуць у дзеянне з 1 верасня 2010 года. Прадстаўленне правядзе супрацоўніца Інстытута беларускай мовы і беларускай літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алена Анісім.

Уваход вольны.

# Паважаныя сябры і прыхільнікі ТБМ

20 снежня (нядзеля) адбудзецца сустрэча моладзі з Аленай Анісім

Тэма: **“Моладзевы рух ТБМ”**

Сустрэча адбудзецца з 12.00-15.00, УВАХОД ВОЛЬНЫ

АДРАС: г. Менск, вул. Румянцава, 13

# Нам патрэбныя Вашы прапановы

Нядаўна мы з Вамі адзначылі 20-я угодкі легальнага існавання ТБМ. Карыстаючыся выпадкам, я выказваю шчырую падзяку усім, хто павіншаваў нас з гэтым святам, як грамадзян Беларусі, так і іншых краін. Зараз трэба рыхтавацца да наступнага года працы.

Просім усіх тых, хто гэтага яшчэ не зрабіў даслаць на рахунак ТБМ сяброўскія складкі за гэты год. Зараз ідзе падпіска на наступны год. Таму просім не забыць пра нашы газеты: “Наша слова” і “Новы час”. Да 15 снежня перашліце свае прапановы для уключэння ў план работы ТБМ на наступны год. Дзякуючы нашым намаганням, напрыканцы верасня з’явіўся ў продажы беларускамоўны адрыўны каляндар “Родны край”. Усе ахвочыя могуць набыць яго ў краме “Акадэмкніга” (Менск). Неўзабаве мы надрукуем кішэнны каляндарык на наступны год, прысвечаны перамозе нашых продкаў пад Грунвальдам (кошт аднаго каляндара – 500 руб.)

Таму за працу, сябры.

**З павагай, Старшыня ТБМ Алег Трусаў.**

# Кал□ за адраджэнне мовы, чытай, спадарства, “Наша слова”!

Шаноўныя сябры, пачалася падпіска на першаеы паўгоддзе 2010 года. У каталогу інфармацыя пра газету знаходзіцца на ст. 74. Цана змянілася мала. На 2009 год газета мае добры рэдакцыйны партфель і плануе для друку тэксты самых розных матэрыялаў, з рознымі поглядамі і падыходамі, у тым ліку і адрознымі ад пазіцыі рэдакцыі. Мы будзем працягваць друк мовазнаўчых і гістарычных матэрыялаў у выкладанні тых аўтараў, якіх вы не знойдзеце на старонках іншых выданняў. Кожны нумар “Нашага слова” - гэта далікатны і свежы зрэз сучаснасці і мінуўшчыны, а ў некаторых выпадках спроба зазірнуць у будучыню. Мы не стараемся навязваць чытачу сваю думку ці погляды. Мы падаём факты. Чытайце, даведвайцеся, думайце. Будзьце з намі, і вы будзеце з усёй Беларуссю.

РП - 1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **АБАНЕМЕНТ** на газету / часопіс | | | | | | | **63865** (індэкс выдання) | | | | |
| ***НАША СЛОВА*** (назва выдання) | | | | | | | | Колькасць камплектаў | | | **1** |
| На 2010 год па месяцах: | | | | | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| X | X | X | | | | | | | | | |

**Каму** (прозвішча, ініцыялы)

**Куды** (адрас)

(паштовы індэкс)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| на газету / часопіс | | | | | | | **63865** (індэкс выдання) | | | | |
| ***НАША СЛОВА*** (назва выдання) | | | | | | | | | | | |
| **Кошт** | падпіскі / пераадрасоўкі | | **8310** руб. / руб. | | | | Колькасць камплектаў | | | | **1** |
| На 2010 год па месяцах | | | | | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| X | X | X | | | | | | | | | |

**Каму** (прозвішча,ініцыялы)

**Куды** (адрас)

(паштовы індэкс)